# Харэограф, рэжысёр... Майстар!

**Калі знаёмішся з выданнямі падобнага кшталту, міжволі з'яўляецца адчуванне, што не кнігу чытаеш, а гартаеш сямейны альбом.**

Або, стаўшы нябачным, прысутнічаеш на сустрэчы сяброў, якія даверальна, шчыра і адкрыта вядуць гутарку пра роднага і блізкага чалавека.

Таму герой кнігі таксама становіцца чытачу бліжэйшым, а праз прызму ўспамінаў яго калег і сяброў бачацца сапраўды значныя, істотныя, вызначальныя рысы яго асобы. Так, дзякуючы руплівай працы ўкладальніка новага выдання з серыі «Выдатныя постаці Беларусі», вядомага этнахарэолага Міколы Козенкі, шырокаму чытачу адкрыліся новыя рысы асобы заснавальніка і кіраўніка легендарных «Харошак», рэжысёра, харэографа Мікалая Дудчанкі.

Пра творчыя і прафесійныя дасягненні Мікалая Рыгоравіча можна распавядаць шмат: паспяховая дзейнасць харэаграфічнага ансамбля «Вяснянка» ў Магілёве, бліскучая кар'ера «Харошак» (калектыў створаны сумесна з Валянцінай Гаявой), поспех ансамбля «Бліскавіца», званне заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь. А яшчэ — рэжысура рэспубліканскіх фестываляў народнага і харэаграфічнага мастацтва, аўтарства сцэнарыяў, пастаноўка юбілейных мерапрыемстваў і тэатралізаваных свят, балетмайстарска-пастановачная праца ў оперы «Дзікае паляванне караля Стаха», аўтарства больш як 100 арыгінальных харэаграфічных мініяцюр, кампазіцый, танцаў, у тым ліку на аснове беларускага харэаграфічнага фальклору...

Адметна, што аўтары тэкстаў з гэтага выдання — сябры, паплечнікі, калегі, сваякі майстра — не спыняюцца адно на пераліку творчых і прафесійных перамог Мікалая Дудчанкі, а звяртаюць увагу перадусім на асабістыя якасці выдатнага рэжысёра. Нядзіўна — хочацца раскрываць сакрэт паспяховасці кар'еры.




*Неўтаймаваны: да 70-годдзя Мікалая Дудчанкі. — Мінск: Беларускі фонд культуры, 2015. — 196 с.*

Які ж ён, легендарны Мікалай Дудчанка, у жыцці і працы?

Ва ўступным артыкуле да кнігі Інеса Каралёва піша: «Ён даруе жанчынам, здаецца, усё. Не даруе толькі благі густ, дрэнную постаць і бестактоўнасць. А вось з мужчынамі ён зусім іншы — задзірысты, азартны, як хлапчук». Кандыдат культуралогіі, загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Вячаслаў Калацэй зазначае: «ён мае ўласны погляд на ўсё: ад лексікі народнага танца і гісторыі фіна-ўгорскага касцюма да геапалітыкі, аналізу акалічнасцей Другой сусветнай вайны і семіятычных, лінгвістычных параўнанняў у тапаніміцы і геральдыцы».

Становіцца зразумела, што перад намі выданне, прысвечанае сапраўды неардынарнай асобе, што ў аснове поспеху вядомага рэжысёра — не толькі талент, але і цяжкая праца, пастаяннае самаўдасканаленне. Пра Мікалая Дудчанку ў гэтай кнізе распавядаюць не толькі яго калегі і паплечнікі з розных гарадоў Беларусі, Расіі, Украіны, але і ён сам. У грунтоўных інтэрв'ю, запісаных Міколам Козенкам, майстар шчыра і даверальна дзеліцца думкамі і пачуццямі, што ён перажываў на розных этапах жыццёвага і творчага шляху, дзеліцца сакрэтамі і назіраннямі. Мікалай Рыгоравіч распавядае: «Прафесійная праца патрабуе каласальнага напружання, удумлівасці, а галоўнае — паспець за кароткі перыяд зрабіць тое, што ў звычайны час патрабуе больш працяглых тэрмінаў».

Зрэшты, ёсць у гэтым выданні і старонкі, не звязаныя з творчай дзейнасцю і рэжысёрска-харэаграфічнай працай майстра. Гэта ўспаміны-пасланне бацьку ад яго дачкі Таццяны, якая абрала прафесію псіхолага.

Асобнай увагі патрабуюць фотаздымкі з асабістага архіва Мікалая Дудчанкі. Мы бачым зусім маленькага хлопчыка з татам, братамі і сёстрамі, сочым за яго прафесійным станаўленнем, жыццёвым шляхам, становімся сведкамі вяселля з Валянцінай Гаявой, ператвараемся ў гледачоў многіх харэаграфічных пастановак і спектакляў. Разам з рэжысёрам чытач трапляе за кулісы і наведвае рэпетыцыі, удзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскага фальклорнага фестывалю «Берагіня»...

Адметна, што ў выданне ўвайшлі і даследаванні самога Мікалая Дудчанкі, яго тэарэтычныя працы і практычныя напрацоўкі адносна беларускага харэаграфічнага фальклору, сцэнарныя планы святкаванняў, метадычныя рэкамендацыі для кіраўнікоў калектываў народнага танца.

**Марына ВЕСЯЛУХА**